прызначэння (арх. А.Порта, захаваліся часткова). У 1964 сабор разбураны, на яго месцы ўзведзены жылы дом. Рэшткі калегіума ўваходзяць у *Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.*
*Т.І.Чарняўская.*

**ПО́ЛАЦКІ ЖЫЛЫ́ ДОМ**, дом Пятра І, помнік архітэктуры з элементамі стылю барока ў г. Полацк Віцебскай вобл. Пабудаваны ў 1692 у цэнтры горада як жылы (на мяжы 18—19 ст. перабудаваны). Мураваны 1-павярховы (з паўпадвальным паверхам) будынак мае ў плане форму няправільнага прамавугольніка. Плоскасці сцен прарэзаны высокімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі з ліштвамі і фігурнымі сандрыкамі, цэнтр. ч. гал. фасада — 2 прафіляванымі філёнгамі. Тарцовы фасад завершаны фігурным атыкам з ляпнымі разеткамі (перароблены ў 19 ст.). Парадныя ўваходныя дзверы дэкарыраваны расл. арнаментам і маскаронамі



Полацкі жылы дом.

(разьба па дрэве). У доме ў 1705 жыў Пётр І. Перад будынкам пастаўлены помнік Л.Талстому. П.ж.д. уваходзіць у *Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.*
*Т.І.Чарняўская.*

**ПО́ЛАЦКІ ЗАВО́Д «ПРАММАШРАМО́НТ»**, адкрытае акцыянернае таварыства. Створана ў г. Полацк Віцебскай вобл. ў 1997 на базе аўтарамонтнага з-да (1959), якому папярэднічаў рамонтны з-д (1947). Асн. прадукцыя (2000): запасныя ч. для аўтамаб. рухавікоў, глушыцелі легкавых і грузавых аўтамабіляў, глебаапрацоўчыя агрэгаты (акучнікі-культыватары, раскідвальнікі ўгнаенняў, зернесушылкі і інш.), блочныя газавыя і вадкапаліўныя гарэлкі для вадзяных і паравых катлоў, хлебапякарных печаў, вентылятары, цеплагенератары, электракаларыферы, тавары нар. спажывання (цяплліцы, парнікі, здрабняльнікі кармоў і інш.), рамонт аўтамаб. рухавікоў, топак зернесушылак.
*А.В.Нікіфараў, У.І.Сямёнаў.*

**ПО́ЛАЦКІ ЗАВО́Д СЕЛЬГАСАБСТАЛЯВА́ННЯ**. Засн. ў г. Полацк Віцебскай вобл. ў 1927 як майстэрні. З 1930 с.-г. майстэрні. У Вял. Айч. вайну разбураны. У 1945 адноўлены як слясарна-мех. з-д. З 1947 ліцейна-мех. з-д. У 1953 здадзены ў эксплуатацыю цэх па вытв-сці чыгуннага ліцця. Пасля рэканструкцыі ў 1959—64 з-д сан.-тэхн. вырабаў і с.-г. інвентару. З 1967 ліцейна-мех. з-д. У 1975—90 галаўное прадпрыемства Полацкага ліцейна-мех. вытв. аб'яднання. З 1990 — сучасная назва. Асн. прадукцыя (2000): аўтапаілкі для буйн. раг. жывёлы і свіней, помпы для даільных установак, запчасткі да трактарных плугоў, чыгунныя фасонна-каналізацыйныя часткі, люкі для камунікацыйных калодзежаў, запорная арматура, сякеры, чыгуннае ліццё для печаў і інш.

**ПО́ЛАЦКІ ЗАВО́Д ШКЛОВАЛАКНА́**. Будаўніцтва пачата ў 1956 у г. Полацк Віцебскай вобл. 1-я чарга здадзена ў эксплуатацыю ў 1957, 2-я ў 1961—63. У 1983 на новай пляцоўцы здадзена ў эксплуатацыю вытворчасць па вырабе шкловалакна аднастадыйным спосабам. З 1983 — Полацкае вытв. аб'яднанне «Шкловалакно». У 2000 запушчана новая шклоплавільная печ. Асн. прадукцыя (2000): шкловалакно, шкланітка, шклотканіна, шкласетка з алюмабарасілікатнага і крэменязёмнага шкла, шклапластыкавыя лыжныя палкі, тэлескапічныя вудзільны і тэхн. пластык.

**ПО́ЛАЦКІ КАДЭ́ЦКІ КО́РПУС**, сярэдняя ваенна-навуч. установа закрытага тыпу ў г. Полацк у 1835—1918. Засн. для падрыхтоўкі да вайск. службы дваранскіх дзяцей з Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай, Віленскай, Гродзенскай і Смаленскай губ. Размяшчаўся ў будынку, дзе раней знаходзіліся *Полацкая езуіцкая акадэмія* і Полацкае вышэйшае піярскае вучылішча. Быў разлічаны на 400 навучэнцаў, прымаліся хлопчыкі ва ўзросце 9—11 гадоў. Складаўся з 4 рот (грэнадзёрская, неранжырная, 2 мушкецёрскія), якія ўтваралі батальён. Меў 2 падрыхтоўчыя і 4 агульныя класы, у 1857 уведзены 5-ы агульнаадук. клас і 2-гадовыя спец. класы, пасля заканчэння якіх кадэты атрымлівалі чын афіцэра. Выкладаліся: рус., франц. і ням. мовы, арыфметыка, алгебра, геаграфія, гісторыя, чыстапісанне, маляванне, чарчэнне, закон Божы; у спец. класах дадаткова — тактыка, артылерыя, ваен. гісторыя і фартыфікацыя. У 1859—63 спец. класы падрыхтавалі 172 афіцэры. У 1865 корпус рэарганізаваны ў ваен. гімназію, якая ў 1882 зноў пераўтворана ў кадэцкі корпус з 7-гадовым курсам навучання. У пач. 1-й сусв. вайны эвакуіраваны. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 рэарганізаваны ў гімназію ваен. ведамства. У 1919—20 на базе П.к.к. і інш. эвакуіраваных кадэцкіх карпусоў былі створаны Крымскі (у Арэандзе) і Феадасійскі кадэцкія карпусы. За час існавання П.к.к. падрыхтаваў больш за 3 тыс. афіцэраў. Сярод іх Д.Д.*Бохан*, браты *Кірпічовы* і *Манцэвічы*, *Р.І.Кандрацэнка*, Н.Н. і М.Н. *Кайгародавы* і інш.

*Літ.*: Долгов И.И. Полоцкий кадетский корпус. Витебск, 1899; Викентьев В.П. Полоцкий кадетский корпус: Ист. очерк. Полоцк, 1910; Дьяков В.А. Деятели русского и польского освободительного движения в царской армии 1856—1865 гг.: (Биобиблиогр. словарь). М., 1965; Лукашэвіч А.М. Арганізацыя вучэбнага працэсу ў кадэцкіх карпусах на тэрыторыі Беларусі ў 30-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. // Весн. БДУ. Сер. 4. 1998. № 3.
*А.М.Лукашэвіч.*

**ПО́ЛАЦКІ КЛЯ́ШТАР БЕРНАРДЗІ́НЦАЎ**. Існаваў у 1498—1832 у г. Полацк Віцебскай вобл. Адзін з першых 4 кляштараў ордэна *бернардзінцаў* у ВКЛ. Засн. вял. кн. ВКЛ Аляксандрам на Запалоцці пры ўпадзенні р. Палата ў Зах. Дзвіну з мэтай схілення праваслаўных у каталіцтва. Верагодна, у гэтым кляштары атрымаў пач. адукацыю *Ф.Скарына.* Драўляны касцёл кляштара пабудаваны ў 1502. У час *Лівонскай вайны 1558—83* ён спалены ў 1563. У 1696 ваявода Д.Слушка зноў запрасіў бернардзінцаў у Полацк і размясціў іх у слабадзе Кабак. Пасля пажару 1758 пабудаваны мураваны касцёл Маці Божай Марыі Нябеснай (асвячоны ў 1769) і жылы корпус. Касцёл быў аднанефавы, з трансептам і 2-вежавым фасадам, памерамі 42 × 25 *локцяў.* У 1772 было 10 манахаў, школа філасофіі. У 1832 кляштар скасаваны, касцёл ператвораны ў правасл. царкву (значна пашкоджаны ў 1930-я г.). Жылы корпус захаваўся.
*А.А.Ярашэвіч.*

**ПО́ЛАЦКІ КЛЯ́ШТАР ДАМІНІКА́НЦАЎ**. Існаваў у 1672—1864 у г. Полацк Віцебскай вобл. Засн. віленскім канонікам Т.Гірскім. Першапачаткова касцёл і жылы корпус былі драўляныя і, як заўважыў дамініканскі гісторык Р.Шымак (1755), «увесь вельмі прыгожы». У 1774 закладзены мураваны касцёл Маці Божай, аднак асн. буд-ва вялося ў 1801—04, таму познабарочная 3-нефавая базіліка з паўцыркульнай апсідай атрымала класіцыстычны фасад. У 1781—1804 пабудаваны мураваны жылы корпус. Пасля скасавання кляштара касцёл дзейнічаў як парафіяльны, разбураны ў час Вял. Айч. вайны.
*А.А.Ярашэвіч.*

**ПО́ЛАЦКІ КЛЯ́ШТАР ФРАНЦЫСКА́НЦАЎ**. Існаваў у 17 ст. — 1832 у г. Полацк Віцебскай вобл. Засн. полацкім войскім К.Храпавіцкім з жонкай Тэафіляй з Сакалінскіх паміж 1628 і 1648 (найб. верагодная дата — 1640). Першыя 2 касцёлы былі драўляныя. Мураваны касцёл св. Антонія пабудаваны ў 1763—75. Уяўляў сабой 3-нефавы храм памерам 14,5 × 9,5 сажняў з 2-вежавым фасадам, у інтэр'еры было 7 алтароў. У 1832 кляштар скасаваны, касцёл пераўтвораны ў царкву, пасля 1917 разбураны. Захаваўся 2-павярховы жылы корпус пач. 18 ст., помнік архітэктуры барока.
*А.А.Ярашэвіч.*

**ПО́ЛАЦКІ КНЯЖАЦКІ ХРАМ**. Існаваў у 12—16 ст. ў г. Полацк Віцебскай вобл. на тэр. Верхняга замка. Рэшткі выяўлены М.Каргерам у час археал. раскопак 1966—67. Храм мураваны, 3-не-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

фавы, 6-стаўповы, крыжова-купальны (24 × 16 м), 3-апсідны (бакавыя апсіды размяшчаліся ў тоўшчы сцяны). Цэнтр. неф з У завяршаўся паўкруглай апсідай, больш вузкія бакавыя нефы — паўкруглымі нішамі ў тоўшчы сцяны. У цэнтры ўзвышаўся купал на круглым светлавым барабане. Да бакавых нефаў былі прыбудаваны прытворы з самаст. апсідамі. Багатую пластыку фасадам нададалі пілястры складанага профілю, аркатурныя паясы, дэкар. арачкі над аконнымі і дзвярнымі праёмамі, закамары. Інтэр'ер быў аздоблены фрэскамі, падлога выкладзена з паліваных керамічных плітак. *А.А.Трусаў.*



Полацкі **княжацкі храм**. Рэканструкцыя П.А.Рапапорта.

**ПОЛАЦКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ.** Засн. і адкрыты ў 1926 у г. Полацк у будынку *Полацкага Сафійскага сабора*, з 1937 у памяшканні б. лютэранскай кірхі 19 ст. Музей зберагаў стараж. рукапісы, калекцыю зброі, выданні 16—18 ст., слуцкія паясы і інш. У Вял. Айч. вайну калекцыя разрабавана. У 1948 музей аднавіў работу як абл. краязнаўчы, з 1954 раённы, з 1985 філіял *Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка*. Пл. экспазіцыі каля 550 м$^2$, 869 экспанатаў асн. фонду (2000). У экспазіцыі знаходкі з археал. помнікаў Полаччыны (крамянёвыя і каменныя прылады працы, керамічны посуд, шыйная грыўні, жаночыя ўпрыгожанні, манеты ВКЛ і Рэчы Паспалітай, бурштынавыя вырабы з Прыбалтыкі, візантыйскія рэчы са смальты і інш.), зброя і адзенне часоў вайны 1812, матэрыялы пра падзеі часоў грамадз. вайны. Этнагр. матэрыялы прадстаўлены экспазіцыяй «Куток бел. хаты канца 19 — пач. 20 ст.», нар. вырабамі ткацтва, ганчарства, пляцення і дрэваапрацоўкі. З 1997 працуе стацыянарная выстаўка, прысвечаная гораду-пабраціму Фрыдрыхсгафену (Германія). Самастойны раздзел экспазіцыі — *Полацкі музей баявой славы.* *В.Д.Краско.*

**ПОЛАЦКІ ЛЕТАПІС**, адзін з першых гісторыка-літаратурных твораў, напісаных на бел. землях. Не збярогся, таму час узнікнення, аўтар, змест і характар дакладна не высветлены. Вядомы паводле нешматлікіх прамых і ўскосных звестак у розных пісьмовых крыніцах. На думку С.М.Салаўёва, У.Ц.Пашуты, Л.В.Аляксеева і інш. вучоных, асобныя ўрыўкі П.л. ёсць у *Кіеўскім летапісе*, які збярогся ў складзе *Іпацьеўскага летапісу* (звесткі пра полацкія падзеі 2-й пал. 12 ст.). Найб. значны і цікавы з іх — апавяданне, датаванае 1159 (фактычна 1158), пра вяртанне ў Полацк выгнанага палачанамі кн. Рагвалода Барысавіча, напісанае рукой відавочцы падзей жыва, з яркімі дэталямі, з выкарыстаннем простай мовы. Як сведчыць рас. гісторык В.М.Тацішчаў, у П.л., адным са спісаў якога ён карыстаўся пры напісанні «Гісторыі Расійскай», расказвалася пра полацкіх, віцебскіх, мінскіх і інш. зах.-рус. князёў. Відаць, летапіс быў прысвечаны гісторыі Полацкай зямлі 10—13 ст. Паводле меркаванняў некат. гісторыкаў (А.П.Сапуноў, М.М.Ціхаміраў), сапраўдным урыўкам з П.л. з'яўляецца і т.зв. аповесць пра Святохну, змешчаная пад 1216 у «Гісторыі Расійскай» Тацішчава (т. 3), хаця большасць даследчыкаў прызнае яе літаратурным творам 17—18 ст. *В.А.Чамярыцкі.*

**ПОЛАЦКІ ЛЯСНЫ ТЭХНІКУМ.** Засн. ў 1921 у г. Полацк Віцебскай вобл. Рыхтуе спецыялістаў для лясной гаспадаркі, заказнікаў, запаведнікаў, лесаўпарадкавальных экспедыцый. Спецыяльнасць (2000/01 навуч. г.): лясная гаспадарка. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае і завочнае.

**ПОЛАЦКІ МАНЕТНЫ ДВОР**, часовы манетны двор няпоўнага тэхналагічнага цыкла для «перепечатания» рас. медных 5 капеек з 16-рублёвай манетнай стапы (колькасць грашовых адзінак, выбітых з адзінкі масы металу) у 10 капеек 32-рублёвай манетнай стапы (падваенне наміналаў). Запланаваны ўказам царскага ўрада Рас. імперыі ад 8.5.1796 у Полацку для перабіцця 1 млн. руб. старымі манетамі. Паводле маніфеста ад 20.1.1797 вярталася 16-рублёвая стапа, выпуск 5 капеек спыняўся. П.м.д. дзейнічаць не пачаў. Перавезенае для яго з С.-Пецярбурга абсталяванне падлягала продажу ў 1811.

**ПОЛАЦКІ МУЗЕЙ БАЯВОЙ СЛАВЫ.** Засн. і адкрыты ў 1971 у г. Полацк як самастойная экспазіцыя *Полацкага краязнаўчага музея*. Пл. 304 м$^2$, 377 экспанатаў асн. фонду, 4 залы (2000). Экспазіцыя прысвечана падзеям на Полаччыне ў часы Вял. Айч. вайны. Сярод экспанатаў схема Полацкага ўмацаванага раёна, матэрыялы пра абарончыя баі 1941, дзейнасць падполля і партыз. руху (схема дыслакацыі партызанаў, макет партыз. кузні і збраёўні, схема блакады фаш. захопнікамі *Полацка-Лепельскай партызанскай зоны*, дыярама «Падрыў нафтабазы», матэрыялы пра выратаванне партызанамі выхаванцаў дзіцячага дома і інш.), дыярама фрагмента лагера смерці ў в. Баравуха 1-я, матэрыялы пра кіраўнікоў і ўдзельнікаў падполля і партыз. руху, у т.л. Герояў Сав. Саюза У.Е.*Лабанка*, Т.С.*Марыненка*, М.С.*Пруднікава*, З.М.*Тусналобаву-Марчанка*, воінаў-вызваліцеляў, палачан, што вызначыліся ў Вял. Айч. вайну. *В.Д.Краско.*

**ПОЛАЦКІ МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ.** Адкрыты 7.9.1990 у г. Полацк Віцебскай вобл.; філіял Нац. *Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка*. Размешчаны ў будынку б. жылога корпуса Богаяўленскага манастыра. Пл. экспазіцыі 670 м$^2$, больш за 1,2 тыс. экспанатаў асн. фонду (2000). Тэматычныя раздзелы: развіццё пісьменства, форм і матэрыялаў кнігі; рукапісная кніга на Беларусі; жыццё і дзейнасць Ф.*Скарыны*; Скарыніяна; кнігадрукаванне 2-й пал. 16—18 ст. і 19—пач. 20 ст.; гісторыя кніжнай ілюстрацыі; развіццё паліграфіі. Сярод экспанатаў помнікі слав. пісьменнасці 11—13 ст., у т.л. праслíцы, фрагменты керамікі, плінфы, тынкоўкі з надпісамі, кірылічныя і лац.-польск. выданні 16—пач. 20 ст. («Евангелле вучыцельнае», 1595; «Катэхізіс» Л.Зізанія, 1788; «Кніга аб веры», 1785 і інш.); выданні зах.-еўрап. друкарняў 16—19 ст. («12 прамоў» І.Фалецкага, 1558; «Фландрыя ў ілюстрацыях» А.Сандэра, 1644 і інш.); фрагмент Торы (канец 18 ст.), маст. творы, навук. працы, падручнікі, слоўнікі, часопісы, газеты, календары, альбомы, буклеты, паштоўкі і інш. выданні 2-й пал. 19—1-й пал. 20 ст.; выданні прыватных *Кухты М. друкарні, Знамяроўскага У. выдавецтва, Клецкіна Б.А. выдавецтва*, друкарань І.Мятлы і І.Дварчаніна, выдавецтва В.Ластоўскага, суполкі *«Загляне сонца і ў наша аконца»*, т-ва *«Адраджэнне»* і інш.; працы і даследаванні пра жыццё і творчую спадчыну Скарыны, матэрыялы Скарынаўскіх чытанняў і міжнар. канферэнцый;



У адной з залаў **Полацкага музея беларускага кнігадрукавання**.